учитывать и проблемы, нередко возникающие с приходом капитала со стороны, который, отдавая приоритет экономике, не всегда проявляет интерес к сохранению идентичности культуры местного населения. Проблемы недостаточной осведомленности местных жителей о значении историко-культурного наследия, постепенно преодолеваются, в том числе и активизацией участия населения в развитии местной экономики.

В связи с этим, учитывая тенденции развития современного жилища, направленные на повышение комфортности проживания, следует учитывать большой потенциал выразительных и уникальных решений традиционной архитектуры национальных меньшинств для устойчивого развития поселений и экономики, в том числе и туризма, Дали-Байского автономного округа. Целесообразно для успешности туристической деятельности сохранять характерные особенности традиционной архитектуры, что будет содействовать повышению интереса туристов к этой части Китая.

Так, в структуре жилищ меньшинств бай, наси, хуэй, ачан, монгольским народам сохранялись свойственные им внутренние дворы, порой с включением двухэтажных объемов строений. При строительстве жилых домов тибетцев, й, хани, буйи, дулун, булан преобладала землебитная технология возведения зданий, с дополнением конструктивных решений деревянным каркасом и с использованием выразительных, но немногочисленных декоративных средств. Жилые дома меньшинств дай, цзинпо, чжуан, лису, мяо, ва, яо, пуни, полаунг и др. предпочтительно возводились на основе деревянных конструкций свайного типа на нижнем уровне и каркаса на верхних уровнях, что обеспечивало формирование контрастных архитектурных форм и выразительных силуэтов крыш.

*Литература*


1. *Тонь, Цинь. Шаси – древний город на древней «Чайной конной дороге» / Цинь Тонь // Дизайн и отделка интерьеров. – 2016. – № 03.– С. 124–127 (на китайском яз.).*
2. *Ван, Хайтао. Сравнение методов сохранения сельских форм деревень Сиденг и Синьхуа в префектуре Дали / Хайтао Ван, Юаньюань Хао // Строительство небольшого города. –2009. – № 04. – С. 99–104 (на китайском яз.).*
3. *Дали-Байский автономный округ. Доходы от внутреннего туризма и зарубежного // URL: https://www.ceicdata.com/datapage/zh-hans/search?search_query (дата обращения: 13.11.2019) (на китайском яз.).*
4. *Че, Чжэньюй. Опыт и обучение при сохранении деревни Дэнцунь в Шаси / Чжэньюй Че, Хайтао Ван // Китайский журнал архитектуры. – 2010. – № S2. – С. 66–70 (на китайском яз.).*


**ARCHITECTURE OF PEOPLE'S HOUSING – POTENTIAL OF THE SPHERE OF TOURISM OF THE DALI-BAY AUTONOMOUS DISTRICT**

**Zhang Yueyang**
**Belarusian National Technical University**

Ethnic minority areas in Yunnan became popular for visiting tourists due to the rapid development of China's tourism market. Interest in the traditional architecture of 20 minorities increased of the Dali Bai Autonomous Okrug. Natural and geographical conditions influenced the formation of features of the economic activities of the local population, as well of features of architectural, structural and artistic solutions of residential buildings. Therefore, efforts should be intensified to study and preserve the architectural heritage of the national minorities of this district.

*Поступила в редакцию 31.01.2020 г.*

УДК 72.04.01

# ВАКОННЫЯ І ДЗВЯРНЫЯ ЗАПАЎНЕННІ Ў АРХІТЭКТУРЫ ФАСАДА: РЭСТАЎРАЦЫЙНА-АДНАЎЛЕНЧЫЯ АСПЕКТЫ

**Шэстак Ю.Т.**
старэйшы выкладчык кафедры “Архітэктура жылых і грамадскіх будынкаў”
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

*У артыкуле зроблена спроба абагульніць спецыфічную ролю дзвярных і ваконных запаўненняў як архітэктурных элементаў, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай фасада. Вызначаны шэраг пытанняў, якія паўстаюць пры рэстаўрацыйна-аднаўленчых працах, і сфармуляваны прапановы для*

*іх развязання, а таксама для выкарыстання ў новым будаўніцтве. Акрэсліваюцца перавагі захавання аўтэнтычных вырабаў і адпаведнасці гістарычным узорам.*

*Уводзіны.* Фасадныя ваконныя і дзвярныя запаўненні праёмаў, створаныя да 1939 г., з'яўляюцца матэрыяльнымі складовымі часткамі аб'ектаў айчыннага дойлідства, значная частка якіх, у сваю чаргу, належыць да архітэктурнай спадчыны Беларусі. Такія запаўненні вартыя асобнай даследчыцкай увагі і ўключэння ў гісторыка-культурны зварот.

Выкарыстанне тых альбо іншых вокнаў і дзвярэй аказвае моцны ўплыў на вонкавы выгляд фасада і, адпаведна, з'яўляецца адным з важных фактараў фарміравання візуальнага асяроддзя ў цэлым. У сваю чаргу, зберажэнне і творчае наследванне аўтэнтычным узорам запаўненняў служыць мэтам захавання характэрных марфатыпаў архітэктуры дзеля пераемнасці з будаўніцтвам мінулага.

*Асноўная частка.* На сёнешні дзень у архітэктуры і мастацтвазнаўстве адсутнічаюць даследванні, спецыяльна прысвечаныя разгляду ролі вокнаў і дзвярэй як атрыбута фасадаў, аднак існуе мноства працаў, якія ў той ці іншай ступені закранаюць гэтую тэму ў кантэксце агульнага разгляду кампазіцыі вонкавага выгляду будынкаў (Ю.Н. Кішык, А. Кучмар, Д.Л. Меладзінскі і інш), а таксама шэраг замежных манаграфій, дзе гістарычныя запаўненні праёмаў прадстаўлены як спецыфічныя вырабы са сваёй сукупнасцю складнікаў, а таксама тэхналогіямі выканання і рамонта (І.А. Кісялёў, Я. Тайхман, М. Таттан і інш). Мэтаю гэтай працы з'яўляецца выяўленне уплыву дзвярных і ваконных запаўненняў на архітэктуру, іх разнабаковай складанай ролі як атрыбута фасада, абумоўленай паўнавартаснай функцыяй гэтых элементаў у якасці дэкора, і адначасова іх утылітарным прызначэннем, а таксама фармуліроўка магчымых спосабаў вырашэння задач, якія паўстаюць падчас правядзення рэстаўрацыйных і рэканструкцыйных працаў.

Натурны агляд дзвярных і ваконных запаўненняў будынкаў мінулых стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі дазволіў скласці агульнае ўяўленне пра сучасны стан гэтых архітэктурных элементаў. У большасці выпадкаў назіраюцца два варыянты: альбо сам аб'ект знаходзіцца ў занядбаным выглядзе і захаванасць запаўненняў адпавядае стану пабудовы, альбо ў выніку правядзення працаў па ліквідацыі фізічнага, функцыянальнага і маральнага зносу дзвярныя і ваконныя вырабы замененыя на новыя, часам па ўзоры аўтэнтычных, але не заўсёды. У выніку нерэгламентаваных замен змяншаюцца мастацкая каштоўнасць фасада як цэласнага твора і вартасць пабудовы як гістарычнай крыніцы ведаў пра мінулае. Катастрафічная сітуацыя са знікненнем арыгінальных ваконных і дзвярных запаўненняў праёмаў у аб'ектах архітэктуры Беларусі, створаных да 1939 г., з'яўляецца падставай для ўважлівага стаўлення да кожнага такога вырабу. Некаторыя з іх можна рэкамендаваць для ўнясення ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: дзверы ў касцёле і царкве ў Ружанах, касцёле Божага цела ў Нясвіжы, дзверы ў грамадскім будынку ў Свіры, вокны і дзверы ў касцёле ў Далёкіх і інш. Таксама вельмі правільным крокам было б абагульніць наяўныя веды і стварыць каталогі абмерных накрысаў дзвярных і ваконных запаўненняў.

Аналіз сучасных працаў па рэстаўрацыі, аднаўленню і замене элементаў дзвярных і ваконных запаўненняў праёмаў у аб'ектах архітэктуры Беларусі, створаных да 1939 г., паказаў, што ў большасці выпадкаў праекты прадугледжваюць выкарыстанне новых вырабаў, зробленых на ўзор мяркуемых аналагаў. Часцей за ўсё гэта адбываецца з-за адсутнасці аўтэнтычных варыянтаў запаўненняў у архітэктурным помніку альбо з мэтай змяншэння долі выдаткаў на запаўненні ў агульным бюджэце,

вылучаным на выкананне праекта. Але асноўнай прычынай замены ранейшых ваконных і дзвярных запаўненняў на новыя з'яўляецца імкненне да паляпшэння камфортнасці перабывання ў сярэдзіне будынку. Аднак на сёнешні дзень у шматлікіх крыніцах, пераважна замежных, падрабязна апісаныя тэхналогіі рамонта і рэстаўрацыі старых вокнаў і дзвярэй, якія дазваляюць дасягнуць павышэння іх тэхніка-эксплуатацыйных якасцяў, якое можна супаставіць з найлепшымі сучаснымі новымі вырабамі. Пры гэтым звычайна падкрэсліваецца, што арыгінальнае металічнае або драўлянае вакно ці дзверы неабходна рэстаўраваць і захоўваць дзеля гістарычнай дакладнасці. Дадатковым чыннікам з’яўляецца тое, што якасць выканання і матэрыял, асабліва драўніна, ў аўтэнтычным запаўненні хутчэй за ўсё будзе лепей за новую копію. Пры невялікіх зыходных дэфектах нават з улікам павышэння спажывецкіх уласцівасцяў аднаўленне атрымаецца эканамічней, чым замена [1, с. 42-44], [2, с. 546-547]. Што тычыцца стратаў энэргіі праз паверхню зашклення – найноўшыя распрацоўкі ў гэтай галіне дазваляюць дасягнуць цеплаізаляцыі высокага ўзроўню без выкарыстання шклопакетаў [3, с. 233-241].

Разгляд праектнай дакументацыі па рамонтна-рэстаўрацыйных і іншых работах, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, прыводзіць да высновы, што любая з іх можа прадугледжваць працу з ваконнымі і дзвярнымі запаўненнямі. Што тычна тэарэтычнай магчымасці аднаўлення страчаных будынкаў мінулага або іх частак, сыходзячы з канвенцыйна дапушчальных матывацый аднаўлення памяці і гісторыка-мемарыяльнай (паводле Х.Г. Надыравай), то і ў гэтым выпадку для стварэння паўнавартаснага абгрунтаванага праекта рэканструкцыі неаб’ходныя ўсеабдымныя веды пра складнікі знешняга выгляду і кожны асобны элемент фасада – г.зн. і пра ваконныя і дзвярныя запаўненні ў тым ліку. Тое ж тычыцца гіпатэтычных рэканструкцыі на новым месцы, створаных з камерцыйнымі мэтамі, як напрыклад парк інтэрактыўнай гісторыі ў Суле. Дзвярныя запаўненні ўваходаў у “Калегіум” і “Дом эканома” дэманструюць выбар выпадковых варыянтаў, які робіць фасады дысгарманічнымі і аддаляе ад рэальных прататыпаў.

У новым будаўніцтве для стварэння сучасных выразных вобразаў, пры пошуках архітэктурнай ідэнтычнасці, якая захоўвае повязь з традыцыяй, праектыроўшчыкі ізноў адчуваюць неабходнасць выкарыстання ў сваёй практыцы разнастайных дэкаратыўных элементаў, у якасці якіх выступаюць таксама ваконныя і дзвярныя праёмы, іх аздабленне і запаўненні [4, с. 7].

У выпадку, калі архітэктурны аб'ект праектуецца ў складзеным раней архітэктурным асяроддзі (а гэта так у большасці выпадкаў), варта ўспрымаць яго не аўтаномна, а як частку буйной прасторавай сістэмы, і шукаць творчыя шляхі ўзгаднення новага будынка з ужо зададзенай маштабнай шкалой навакольных пабудоваў.

Пры рэканструкцыі фасадаў трэба памятаць пра структурную арганізацыю сувязяў паміж асобнымі элементамі, спецыфічную для розных эпох. Першыя пабудовы адрозніваліся невялікімі ваконнымі праёмамі, месца для якіх вызначалася нерэгулярна размешчанымі памяшканнямі. У цэлым дамініравала плоскасць сцяны. Пачынаючы з позняй готыкі вокны імкнуліся размяшчаць упарадкаванымі шэрагамі. Архітэктурна-кампазіцыйнае афармленне элементаў падкрэслівала вертыкальны рытм і тэктоніку фасада [5, с. 153].

Выкарыстанне ў рэстаўрацыі, рэканструкцыі і новым будаўніцтве узораў аўтэнтычных ваконных і дзвярных запаўненняў, якія звычайна маюць дробную дэталізацыю і сувымерны чалавеку маштаб, можа дапамагчы забяспечыць супадпарадкаванасць архітэктурных

элементаў і іерархічнасць архітэктурных форм. “Дасягненне ж іерархічнасці структуры судзейнічае фарміраванню цэласнай архітэктурнай кампазіцыі як сістэмы” [6, с. 10]. Пры рэстаўрацыйна-аднаўленчых працах на помніках архітэктуры важным чыннікам застаецца патрэба захавання стылістычнай адпаведнасці запаўненняў агульнаму вобліку фасада. Тэарэтычныя палажэнні пра ўніверсальныя сродкі архітэктурнай кампазіцыі, у тым ліку архітэктурнага маштаба і маштабнасці, колера адносяцца як да ўспрыняцця архітэктурнай формы, так і да форматворчасці. Такім чынам, гэта інфармацыя з'яўляецца аднолькава важнай як для перадпраектных вышукванняў пры працы з гістарычна каштоўным асяроддзем і яго аб'ектамі, так і для новага будаўніцтва.

Па сваёй функцыі вокны і дзверы падзяляюцца на дэкаратыўныя, функцыянальныя, універсальныя. Запаўненні праёмаў паводле сваёй дэкаратыўнай функцыі ва ўзаемадзеянні з фасадам могуць быць:

– часткай архітэктурнага вобраза, гарманізаванай з фасадам;

– асобным самадастатковым мастацкім творам, які ў сваю чаргу або кантрастуе з агульным вырашэннем, або дапаўняе яго;

– сродкам прыцягнення ўвагі;

– перашкодай для ўспрыняцця вобраза;

– дапаможным сродкам дэманстрацыі функцыянальнага прызначэння будынка (крама, аранжарэя, і г.д.)

– выпадковымі элементамі, якія не спалучаюцца па сэнсе з функцыянальным прызначэннем будынка, заблытваюць назіральніка (праз змяненне функцыі, праектную памылку і г.д.).

У кнізе прафесара Яна Тайхмана “Stolarka okienna w Polsce: rozwoj i problematyka konserwatorska” аўтар на падставе аналіза графічных выяваў фасадаў разнастайных помнікаў архітэктуры прыходзіць да наступных высноваў, якія з невялікімі ўмоўнасцямі цалкам дапасоўваюцца як да вокнаў, так і да дзвярэй: характар фасада змяняецца разам са зменай вaконных запаўненняў; вокны, якія ўзніклі адначасова з фасадам, выглядаюць больш за ўсё з ім гарманізаванымі; створаныя пазней за фасад вокны «выпадаюць» з яго, ўтвараючы «правалы»; чым больш фрагментаваны фасад, тым большы дысананс стварае замена на запаўненняў на такія з шыбамі, буйнейшымі па памеры; чым больш пасечаны фасад, тым лепей кампазіцыйна звязаныя з ім вокны з дробнымі падзеламі на часткі [1, с. 38].

Абапіраючыся на гэтыя і раней выкладзеныя высновы можна сфармуліраваць шэраг рэкамендацый па выбару дзвярных і ваконных запаўненняў праёмаў пра рэстаўрацыйна-аднаўленчых працах дзеля захавання мастацкай каштоўнасці фасада як цэластнага архітэктурнага твора:

1. Прыняць за прыярытэт захаванне аўтэнтычнага запаўнення пры яго наяўнасці ў архітэктурным помніку.

2. У выпадку дапушчэння рэканструкцыі страчаных запаўненняў пры наяўнасці захаваных на тым жа аб’екце выкарыстоўваць арыгінальныя вырабы за ўзор для выканання новых. Пры гэтым важна забяспечыць магчымасць адрозніць новыя запаўненні ад аўтэнтычных дзеля пазбягання фальсіфікацыі іх як гістарычнага дакумента.

3. У выпадку поўнай рэканструкцыі будынка або пры факце адсутнасці аўтэнтычных дзвярэй і вокнаў выкарыстоўваць за ўзор для выканання новых запаўненняў аналагі максімальна набліжаныя па часе, лакалізацыі, і калі магчыма ўстанавіць, аўтарстве выканаўцаў і персоне замоўцы. Пры гэтым забяспечыць магчымасць адрозніць новыя запаўненні ад старых. Дзеля гэтага варта выкарыстоўваць адпаведныя традыцыйныя дэкаратыўныя прыёмы, але новыя тэхналогіі і матэрыялы. Таксама патрэбна звяртаць увагу на сувязь запаўненняў з захаванымі інтэр’ерамі памяшканняў.

4. Для адноўленых пасля частковага разбурэння фасадаў можна разгледзець варыянт з рэканструкцыяй страчанага

малюнка запаўненняў менавіта на тых кавалках, дзе будынак дэманструе сваю захаваную частку, што дазволіць дадаткова падкрэсліць яе гістарычную каштоўнасць на фасадзе.

5. Пры рэканструкцыях помнікаў архітэктуры і праектаванні новых будынкаў у гістарычна каштоўным асяроддзі выкарыстоўваць для запаўненняў праёмаў агульнае чляненне, па маштабе і ўзроўню прапрацаванасці тоеснае адпаведным традыцыйным прыкладам, але для мастацкага вырашэння дэталізацыі выкарыстоўваць сучасныя дэкаратыўныя сюжэты, бачныя пры блізкім разглядзе. Пры гэтым пазбягаць узбуйненых, спрошчаных чляненняў ваконных і дзвярных запаўненняў, якія разам з недэталізаванымі плашчынямі фасадаў паміж праёмамі аказваюць уражанне больш значных па маштабе будынкаў, ствараючы выразны кантраст з асяроддзем.

6. У новым будаўніцтве ў любым асяроддзі можна выкарыстоўваць сучасную канструкцыю запаўненняў з накладзеным на яе дэкорам паводле ўзораў мясцовай даўніны дзеля забеспячэння пераемнасці з мінулым і утварэння дэталізацыі, якая адпавядае чалавечаму маштабу.

7. У аб’ектах сучаснай архітэктуры на новазабудоўваемых пляцоўках можна ўжываць дзверы і вокны – у выглядзе запаўненняў або ў комплексе са знешняй аздобай праёмаў – ідэнтычныя ўзорам мінулага, прынамсі ў прасторы першых паверхаў (гарадскога партэру).

Калі ў выпадку рэканструкцыі страчаных запаўненняў, або ў новым праектаванні паводле традыцыйных узораў, будуць выкарыстоўвацца драўляныя або металічныя вокны і дзверы замест менш экалагічных пластыкавых, гэта дазволіць павысіць долю выкарыстання айчынных матэрыялаў у вытворчасці, сфарміраваць запыт на з’яўленне новых мясцовых выканаўцаў і рост узроўню іх майстэрства.

*Заключэнне.* Ваконныя і дзвярныя запаўненні праёмаў з’яўляюцца неад’емнымі складнікамі фасада, часткай яго дэкора і каларыстыкі, важным фактарам фарміравання візуальнага асяроддзя і павышэння яго разнастайнасці і камфортнасці. Пры рэстаўрацыйна-аднаўленчых працах рэкамендуецца:

– забяспечваць прыярытэт аўтэнтычных элементаў перад заменай;

– у выпадку рэканструкцыі страчаных запаўненняў выкарыстоўваць арыгінальныя вырабы за ўзор для выканання новых;

– у выпадку поўнай рэканструкцыі будынка або пры адсутнасці аўтэнтычных дзвярэй і вокнаў выкарыстоўваць за ўзор аналагі максімальна набліжаныя па часе і лакалізацыі;

– для часткова аднoўленых фасадаў дапушчальны варыянт з рэканструкцыяй страчанага малюнка запаўненняў там, дзе дэманструецца захаваная частка будынка;

– улічваць асаблівасці інтэр’ера памяшканняў, які вымагае адпаведнага выгляду гэтых архітэктурных элементаў з сярэдзіны;

– пры рэканструкцыях помнікаў архітэктуры і праектаванні новых будынкаў у гістарычна каштоўным асяроддзі выкарыстоўваць для запаўненняў праёмаў агульнае чляненне, па маштабе і ўзроўню дэталізацыі тоеснае адпаведным традыцыйным прыкладам з выкарыстаннем сучасных дэкаратыўных сюжэтаў;

– у новым будаўніцтве ў гістарычна каштоўным асяроддзі выкарыстоўваць сучасную канструкцыю запаўненняў з накладзеным на яе дэкорам паводле ўзораў мясцовай даўніны дзеля забеспячэння пераемнасці і утварэння адпаведнай дэталізацыі;

– у аб’ектах сучаснай архітэктуры магчыма ўжываць запаўненні вокнаў і дзвярэй у комплексе са знешняй аздобай праёмаў ў прасторы першых паверхаў.

Рэкамендацыі па выбару дзвярных і ваконных запаўненняў праёмаў арыентаваны на захаванне мастацкай каштоўнасці фасада як цэласнага архітэктурнага твора і выкарыстанне характэрных мар-

фатыпаў у новым будаўніцтве з мэтай візуальнага ўсталявання гістарычнай пераемнасці сродкамі архітэктуры.

Рэкамендуецца ўнесці шэраг захаваных аб'ектаў у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, а таксама стварыць альбом абмерных накрысаў тых запаўненняў, якіх магчыма.

*Літаратура*

1. *Tajchman, J. Stolarka okienna w Polsce. Rozwoj i problematyka konserwatorska / J. Tajchman. – Warszawa : Ośrodek Dokumentacji Zabytków 1990. – 82 s.,*
2. *Calloway, S. The elements of style : an encyclopedia of architectural detail / S. Calloway. – New York : Firefly Books, 2005. – 592 p.*
3. *Бадьин, Г. М. Технологии строительства и реконструкции энергоэффективных зданий / Г. М. Бадьин, С. А. Сычев, Г. Д. Макаридзе – Санкт-Петербург : БХВ-Петербург, 2017. – 464 с.*
4. *Декор в архитектуре : Новые аспекты взаимодействия искусств : Материалы науч. конф. молодых ученых, Москва, 19 апреля 2016 г. / Союз московских архитекторов ; сост.: С. М. Царева, А. В. Васильева. – Москва : ЛЕНАНД, 2016. – 200 с.*
5. *Кучмар, А. Основы архитектурного формообразования / А. Кучмар. – Москва : Стройиздат, 1984. – 224 с.*
6. *Кишик, Ю. Н. Архитектурная композиция : учебник / Ю. Н. Кишик. – Минск : Вышэйшая школа, 2015. – 208 с.*

**WINDOWS AND DOORS IN ARCHITECTURE OF ELEVATIONS: CONSERVATION AND RESTORATION ASPECTS**

**Shestak Yuliya**
**Belarusian National Technical University**

The paper discusses and summarises the particular role of door assemblies and window assemblies as architectural elements that are integral parts of an elevation. It identifies a range of issues that emerge in the course of conservation and restoration works and defines proposals for their solutions, as well as for application in new building construction. The article highlights at the same time the advantages of preserving such authentic elements and of keeping in line with their historical examples.

*Поступила в редакцию 31.01.2020 г.*

УДК 728.83+712+72.03

# PECULIARITIES OF THE SPACE FORMATION OF THE PALACE-PARK AND MANOR OBJECTS OF POLTAVA PROVINCE (UKRAINE) OF THE XVIIIth – MID-XIXth CENTURIES

**Shevchenko L.S.**
Ph. D, Assoc. Prof.
National University "Yuri Kondratyuk Poltava Polytechnic"

*The space formation of the territories and main buildings of the palace-park and manor complexes of Poltava province (central part of Ukraine) of the XVIIIth – mid XIXth centuries are presented in the paper. This research is based on the comprehensive analysis of these objects. The reason for the research is the danger of the destruction of manor complexes, the loss of a significant cultural and historical heritage not only of the Poltava region, but also of Ukraine as a whole. In this work the complex methodology of the research is used, based on the historical-theoretical, comparative-historical, empirical and graphical methods. The author worked out the funds of national and state libraries, Ukraine archives (in Kyiv, Kharkiv, Poltava), reference and information funds of research institutes, local lore museums (in Poltava, Dikanka, Berezova Rudka, Gogolevo), departments for the protection of monuments of the historical environment the Poltava Regional State Administration and the Association Company "Ukrrestavratsiya" (Kyiv) and private collections of local ethnographers, witnesses of settlement's inhabitants. As a result – the functional organization of the investigated objects is clarified, their regional features are revealed.*

*Introduction.* Preservation and protection of the national historical and cultural heritage is one of the important issues of the state policy of Ukraine. This is supported by the current memorandum legislation and extensive work of deep studying of the architectural and urban heritage of Ukraine in order to preserve its national and regional traditions. The solution to this issue is based on a careful research of all preserved monuments, both on the territories of Ukraine as a whole, and in selected specific regions.

I. Ignatkin, Y. Neelgovsky, V. Timofiyenko, N. Novakovska, I. Kosarevsky, I. Ro-